В. ШВЕД

# ЖЫЦЦЁВЫЯ СЦЕЖКІ

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

ВІКТАР ШВЕД

# Ж Ы Ц Ц Ё В Ы Я
# С Ц Е Ж К І

KAMUNIKAT.org

Выдавецтва ГП БГКТ - Беласток 1967

**Мастак Уладзімір Карпенюк**

KAMUNIKAT.org

# БАЦЬКОЎСКІ
# ПАРОГ

KAMUNIKAT.org

## БЕЛАСТОЧЧЫНА

Беласточчына, зямелька родная,
Жывеш заўсёды ты ў глыбі маіх грудзей.
Мясціны не сустрэў ў жыцці ніводнае,
Якая б мне была хоць крышку даражэй.

Вось родны краявід, палоскі вузкія,
Якія дробніць люд вясковы з года ў год.
Сярод палёў – пасёлкі беларускія,
Дзе адвякоў жыве мой дарагі народ.

Там села, як грыбок, хатка вясковая,
Дзе крокі першыя ў жыцці сваім рабіў,
Дзе ад бацькоў вучыўся роднай мовы я,
І я ніколі мовы гэтай не забыў.

На Беласточчыне пражыў я маладосць,
А найважнейшае – я нарадзіўся тут.
Найдаражэйшаю таму была і ёсць
Мне Беласточчына, мой родны, мілы кут.

kamunikat.org

## РОДНАЯ МОВА

Мова ты родная, мова прыгожая,
Як жа мы можам цябе не любіць!
Ты пратрывала атакі варожыя,
Не здолеў ніхто цябе пакарыць.

Ты пад страхою знайшла саламянаю
Прытулак ад цяжкай навалы, нягод,
Цябе, мова, носіць з вялікай пашанаю
У сэрцы сваім беларускі народ.

Паднятая сілай Купалы і Коласа
Змагла ўсе правы ты свае адстаяць,
Змагла ты дайсці да магутнага голасу
І месца пачэснае ў свеце заняць.

Калі нехта скажа: ёсць мовы мілейшыя,
Яму адказаць я заўсёды гатоў:
Найпрыгажэйшая, найдаражэйшая
Мова зямлі роднай – мова бацькоў.

KAMUNIKAT.org

## МАЦІ

Кіруеш, маці, слабы зрок
Туды, дзе мае праз хвіліну
Цягнік праходзіць, мо здалёк
Вязе ён дарагога сына.

Ты сэрцам вычула – прывёз,
З усмешкай сын дадому крочыць,
Стрымаць не можаш сваіх слёз,
Твае ад шчасця плачуць вочы.

Але на жаль, твой сын ізноў
Пакіне дом. Засвішча вецер...
На развітанне замест слоў
Ты плачаш зноў, як пры сустрэчы.

О, колькі ў сэрцы пачуцця!
З прычыны радасці, ці гора,
На працягу свайго жыцця
Слёз маці выплакала мора.

KAMUNIKAT.org

## У РОДНАЙ ХАЦЕ

На змярканні з настроем прыўзнятым
Уваходжу ў бацькоўскую хату,
На усім свой спыняючы зрок.
Кажухом атуліўшыся, мама,
Ужо стомлена працай, гадамі,
Паднялася на цвёрды палок.
Але толькі угледзела сына –
Супыняе кароткі спачынак,
Мітусіцца у хаце ізноў.
Як калісьці малое дзіцятка,
Незвычайна чуллівая матка
Да грудзей сына туліць без слоў.
А з-за коміна печы кафлянай
Пазірае на сына з пашанай
Бацька з белай чупрынай, як лён.
Як калісьці па працы, на печы
Грэе ўжо спрацаваныя плечы,
У цяпле тут праходзіць і сон.
Для выгоды на печы ў куточку,
Прымасціў сабе скрыначку-точку,
Каб што новага ў свеце – пачуць.
Рамантычных мелодыяў гукі
Усыпляюць. З газетаю рукі
На запалыя грудзі плывуць.

Электрычная лямпа пад столлю
Назаўсёды сапхнула ў падполле
І капцілкі агеньчык, і змрок.
Пры яскравым святле дык нясмела
На хрыста раме ўжо спарахнелай
Свае кросны снуе павучок.

KAMUNIKAT.org

## Я БЕЛАРУС

Я беларус, рос у народнай гушчы,
Сярод палёў, у квечаных лугоў,
Пад дзіўны гоман Белавежскай пушчы,
Пад заліўныя трэлі салаўёў.

Я беларус, рос у сялянскай хаце,
Праз спарахнелы рачкаваў парог.
Любоў да спрацаваных бацькі, маці
У глыбіні грудзей сваіх збярог.

Я беларус, я сваёй роднай мовы
Яшчэ дзіцём вучыўся ад бацькоў.
Таму адно з той мовы нават слова
Мне даражэй, чым з іншых сотні слоў.

Я беларус і гэтым ганаруся.
Усім душу сваю магу адкрыць:
Ніколі і нідзе не адракуся,
Што беларусам жыў і буду жыць!

## БАЦЬКОЎСКІ ПАРОГ

Дзе б толькі мяне лёс не кінуў
З далёкіх і блізкіх дарог,
Заўсёды знаду пуцявіну
Нв родны, бацькоўскі парог.

Знаёмае ўсё тут з маленства,
Прырода, усмешкі людзей,
Аднак штораз менш падабенства
З тым, што аглядаў тут раней.

Дарогі, дарогі... і тыя
Змяняюць свой від на вачах.
Уздоўж іх слупы-вартавыя
Трымаюць драты на плячах.

Пабег па дратах, як па жылах
Падстрэхі вясковы яток.
Дзе цьмяна капцілка свяціла,
Святло залунала здалёк.

Чуваць гул матораў на нівах,
І песні чуваць мілы тон
Людзей працавітых, руплівых,
Што выйшлі сабраць свежы плён.

kamunikat.org

О, колькі ж у вас прыгажосці
Палі з ураджаем, лугі,
Мясціны маё маладосці,
Бацькоўскі парог дарагі...

KAMUNIKAT.org

## РУКІ МАЦІ

У жыццёвай восені позняй
Патрэсканыя, як баразны.
Прапахлыя прэлаю глебай
І свежым жытнёвым хлебам.
У працы цяжкай да болю
З сярпом абягалі ўсё поле.
У глебу жменька за жменькай
Сеялі збожжа з сявенькі.
У часе мужа нядугі
Часта трымаліся плуга.
Валодалі добра касою
І цэпам у пуні зімою.
На вопратку дзецям і мужу
Лён пралі і ткалі кужаль.
Сыночка галубілі многа,
Пасля адпраўлялі ў дарогу.
І гэтыя ж самыя рукі
Галубяць і песцяць унукаў.
О, рукі, без жаднай заганы,
Дастойныя заўжды пашаны,
Найбольшае ў свеце багацце –
Рукі маці.

KAMUNIKAT.org

## ВЁСКА

Дзе толькі не гляну я, бачу
Да горада вёскі імкненне.
Жыве сёння вёска іначай,
Яна нават пахне ўжо меней

Страхою жытнёвай,
Лесам-дубровай,
Пушчанскай жывіцай,
Льнянай кастрыцай.

Горад прыехаў здалёку
На звонкагалосых маторах,
Прыплыў электрычным токам.
Гулу матораў не ўторыць

Драўляных стук калёс,
Кляпанне звонеіх кос,
Тачэнне сярпоў,
Рытмічны стук цапоў.

Знікаюць драўляныя хаты,
Знікае на дахах салома.
Лягла чарапіца на латах,
Расце дом цагляны за домам.

А прадзедаў мовы багатай
Не здраджвае праўнук. З пашанай
Яе са старэнькае хаты
У дом пераносіць цагляны.

KAMUNIKAT.org

## ЛЕТНІ РАНАК

Скінуўшы з плеч хустку ночы,
Вёска сустрэла світанне.
Прамыўшы расой летняй вочы
На сонцы грэецца раннім.

Бяроза расчэсвае косы
Грэбенем хісткага плоту.
Стары жураве ль з доўгім носам
Вартуе нектар на спякоту.

Над хатай, раскінуўшы рукі,
Спакойна стаіць вяз-старэча.
Плыве па вясковым бруку
Мора кароў і авечак.

У вёдрах жанчыны-даяркі
Нясуць сырадою багата.
Як па сігналу, цыгаркі
Кураць вясковыя хаты.

KAMUNIKAT.org

## ДУХМЯНЫ ХЛЕБ

Вкр бы разгалістыя
Над дарогай моляцца.
Птушкі трэляй чыстаю
Звоняць нвл ваколіцай.

Промні сонца-волата
Сілай жыццядайнаю
Песцяць нівы-золата –
Збожжа ураджайнае.

Выйшлі ў поле з косамі
Людзі загарэлыя
І кладуць пракосамі
Азіміны спелыя.

У пунях малоціцца
Збожжа, з ніў сабранае,
І на стол наш коціцца
Булкамі духмянымі.

## НАШЫЯ ПРЫГАЖУНІ

Валасы ільняныя,
Вочы васільковыя,
Тварыкі румяныя,
Ручанькі зларовыя.
У працы не лянівыя
У хаце непаседлівы,
Для людзей зычлівыя
І надзвычай ветлівы.
Заўжды служаць радаю,
Шчырай дапамогаю.
Ніколі не падаюць
Прад бурай-трывогаю,
Пад цяжкою ношаю,
Пад жыцця нагрузкаю.
Прыгажуні нашыя,
Кветкі беларускія.

KAMUNIKAT.org

**РОЗДУМ**

Узварушваў з натугай папар
Конь заморана працаю, слабы.
Часта лаяў яго гаспадар,
Пугай сек пахудзелыя скабы.

Гул мвтора за стужкай-мяжой
Памуціў цішыню наваколля.
Узнімаючы пыл за сабой,
Трактар кроіў засохлае поле.

Вось які небывалы размах
У галеўшай адвечна старонцы!
У засмучаных конскіх вачах
Гаслі промні зайшоўшага сонца.

KAMUNIKAT.org

**ВЯТРАК**

За вёскай, у полі, на ўзгорку,
Дзе ўецца гасцінец-бальшак,
Аб долі задумаўся горкай
Стары спарахнелы вятрак.

,,Найбольш адзінокі на свеце,
Аджыў, як відаць, я свой век,
З мяне насміхаецца вецер,
Пакінуў мяне чалавек.

Не рвуцца ў палёт мае крылы,
Шчаслівых не ўбачыць ім дзён,
Не хопіць напэўна ім сілы
Каб з месца крануць мой жарон".

## АПОШНІ РАМІЗНІК

Паўзе ў гулкі горад ноч чорнаю кошкай,
У зрэнках ёй ззяе агонь.
Рамізнік стары дрэмле ў вулцы на дрожках,
І дрэмле рамізніцкі конь.

Так мроіцца ім: пасажыраў хоць трошкі
І грошыкаў трошкі ў далонь.
Чакае рамізнік, чакаюць і дрожкі,
Чакае рамізніцкі конь.

А побач машыны снуюцца, як мошкі
І звоняць трамваі: дзынь-дзонь.
Сумуе рамізнік, сумуюць і дрожкі,
Сумуе рамізніцкі конь.

Дамоў конь пляцецца ледзь ножка за ножкай,
На козлах дзядуля Лявонь.
Апошні рамізнік, апошнія дрожкі,
Апошкі рамізніцкі конь.

KAMUNIKAT.org

## БУКЕТ ГВАЗДЗІКІ

Вакзал.
Перон.
Стаю я між людзей.
Кругом трывожнае чаканне.
Стаю
і прытуляю да грудзей
букет гваздзікі ў цэлафане.
Гудок
здалёк.
На гарызонце дым
і колаў стук расце няспынна.
Віруюць думкі аб адным:
Ці едзе мілая дзяўчына?
Цягнік надзей
спыніў свой доўгі ход,
дыхнуў агнём з грудзей гарачых.
З вагонаў выплыў на перон народ –
на жаль, каханае не бачу.
Няма.
Дарма
яе шукае зрок.
У сэрцы сум расце вялікі.
Народ адплыў. Стаю я адзінок,
трымаю непатрэбныя гваздзікі..

Kamunikat.org

Туды,
сюды
бязмэтна я хадзіў.
У сэрцы боль перамагаў каханне.
Жанчыне незнаёмай уручыў
букет гваздзікі ў цэлафане.

KAMUNIKAT.org

## НАД МОРАМ

Цалуе далікатна мора
Пясчаны бераг хваляй пеннай.
Людзі ад вадзяных прастораў
Былі ў дзівосным захапленні.

Пляж аддзяляўся жоўта-белы
Адгладзі вадзяной бясконцай.
Разам з людскім сагрэтым целам
Купалася у хвалях сонца.

Раптам знікае смех на тварах,
Сэрцы сціскаюцца балюча.
Ідзе на пляж, за парай пара,
Дзяцей грамадка невідучых.

Селі і ўмора са здзіўленнем
Глядзяць патухлымі вачыма.
Марскіх хваль чуюць шапаценне,
Аднак убачыць – немагчыма.

За ручкі ўзяўшыся, шнурочкам
Пайшлі ізноў крутою сцежкай.
На тварыках і ўсляпых вочках
Я ўбачыў... весялосць, усмешку.

Дзяцей тых напаткала гора,
Іх лёсу нельга перайначыць.
Прыехалі здалёк да мора,
Каб мора гэтага не ўбачыць.

KAMUNIKAT.org

## САДОЎНІК І РУЖЫ

Трымаючы ў руках умела ножны,
Садоўнік ружам абразаў галінкі.
Нямнога сід у старасці трывожнай –
Прысеў ён на пяньку да адпачынку.

Галінкі стройных, сакавітых ружаў
Умела навучыўся амалоджваць.
А сам – такі старэнькі і нядужы -
Сябе, на жаль, амаладзіць не можа.

KAMUNIKAT.org

**ГАЛІНКА БЭЗУ**

Ля хаты сваёй адвячоркам
Ты мне адламала галінку.
Ірдзелі ліловыя зоркі,
Алмазам блішчэлі расінкі.

На бэзе расцвіўшым ў вагоне
Я росныя кроплі ўбачыў –
Здавалася, ціха ў далонях
Галінка духмяная плача.

Яе прыгажосць дагасала,
Галінка ўмірала ціхутка.
Чаму, о чаму ты завяла,
Пакінуўшы ў сэрцы шмат смутку?..

KAMUNIKAT.org

## ПЕРШЫ СТРЭЛ „АЎРОРЫ”

*Якубу Мартынюку з вёскі*
*Новае Беразова, быломy матросу*
*„Аўроры”, прысвячаю*

Халодныя хвалі Балтыйскага мора
Ў высокі ўздымаліся вал.
На неўскім прычале стаяла „Аўрора”,
Чакала на першы сігнал.

І вось стрэл сігнальны раздаўся з гарматы,
Пранёсся над горадам гук.
У дыме, з рукой над вачыма паднятай,
Стаяў мой зямляк Мартынюк.

Глядзеў ён на Зімні і думаў аб долі...
Ці ведаў, здаецца, наўрад,
Якую мець будзе ў гісторыі ролю
Той першы сігнальны снарад.

Не ведаў яшчэ, што снарад яго – гэта
Пачатак кастрычніцкіх дзён,
Што новую эру абвесціць ён свету,
Якая знясе можных трон.

Прайшло многа год, калі быў гальванёрам,
Стары ўжо, і розным меў лёс.
Ды толькі пачні гаварыць пра „Аўрору” –
У ім аджывае матрос.

## ВЯЛІКАМУ КАСТРЫЧНІКУ

Кастрычнік – месяц бур і непагод.
Ён гнеўнай хваляй ўсе сарваў заторы.
Да волі зваў прыгнечаны народ
На стрэл сігнальны з крэйсера ,,Аўроры".

Пайшоў не бой увесь працоўны люд,
Пайшлі сялянскія лапцюжныя калоны,
Каб вызваліць народы з цяжкіх пут,
Каб не было больш гора і прыгону.

Насталі дні вялікіх перамог,
Прайшла нядоля, цяжкі лёс жабрачы.
Ў далечыню кастрычніцкіх дарог
Глядзім, і шчасце там сваё мы бачым.

Збылося многа дум людскіх і мар,
Праменнямі кастрычніка сагрэтых.
Яго святкуе сёння зямны шар,
А заўтра мо і іншыя планеты.

**ЛЯ МАЎЗАЛЕЯ ЛЕНІНА**

Так многа нас з ўсяго зямнога шара
Прыехала на свята у Маскву.
Мы прывязлі у сэрцах свае мары,
Каб Леніна убачыць наяву.

Мы, маладое свету пакаленне,
Плячо ў плячо ішлі жывым вянком
Чырвонай плошчай, дзе вялікі Ленін
Спачыў у маўзалеі вечным сном.

Я ганарыўся, што ў маёй краіне
Правадыра асталіся сляды,
Што ля Карпат, у вёсцы Параніне,
Пражыў вялікі Ленін два гады.

Што думаў чэх, сусед мой, мне цікава,
Відаць, таксама ён прыпамінаў,
Што ў яго Празе, над ракою Влтавай,
Калісьці Ленін многа працаваў.

І побач немец ўспамінаў, здаецца,
Што ў Лейпцыгу вялікі чалавек
Выкрэсваў „Іскру”, даў ёй разгарэцца,
Каб тым свяціць, што церпяць гвалт і здзек.

Што думаў негр – гадаць аб тым не трэба.
Аб тым сказалі слёзы у вачах:
Далёка ад Масквы радзімы неба,
Але і там ўсе знаюць Ільіча.

Павёз негр вобраз Леніна у сэрцы,
У Афрыку забраў яго з сабой,
Каб той народ, што стогне ў паняверцы,
Павесці за сабой у апошні бой.

KAMUNIKAT.org

## ГРАМАДА

Стотысячнай, магутнай грамадою
Пайшлі пад вызваленчыя сцягі.
Народ працоўны клікалі да бою,
Ліхой няволі рвалі ланцугі.

Крыві працоўных пралілося многа
І шмат людскіх прынесена ахвяр.
Змаганне набліжала перамогу,
Здзяйсненне векавых народных мар.

Жыццё плыло цяжкою каляінай.
Пайшлі ў нябыт кашмарныя гады.
У шчасці нашай вольнае краіны
Цаглінка ёсць змагання ,,Грамады”.

## КАСТУСЮ КАЛІНОЎСКАМУ

*Будаўнікам Дома культуры*
*імя Кастуся Каліноўскага ў Гарадку*
*п р ы с в я ч а ю*

З бацькоўскай вёскі Мастаўляны,
Мо і не раз праз Гарадок
Ішоў з наборам палымяным
,,Мужыцкай праўды” ў Беласток.

Складаў з вялікаю адвагай
Свае бунтарскія радкі,
Распальваў сэрцы пад сярмягай –
Ішлі змагацца дзецюкі.

Ішлі на панскія палацы,
За пот, за голад, мазалі.
Ішлі свабоды дамагацца,
Хлеба працоўным і зямлі.

За незалежныя краіны,
За Польшчу і за Беларусь,
За дарагі народ загінуў
Ў няроўнай барацьбе Кастусь.

Аддаў жыццё за наша шчасце,
За волю, роўныя правы.
Адкрыты нашы сэрцы насцеж –
У іх Кастусь заўжды жывы.

## ПАМЯЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Дзе Чарнамор'я пеністыя хвалі
Аб прыбярэжны дробяцца валун,
Там сумныя акорды прагучалі
З апошніх, абрываючыхся струн.

Замоўкла ліра слаўнага паэта,
Замоўк хваробай скошаны пясняр.
І толькі несмяротныя санеты
Нам раскрываюць дум сакрэт і мар.

У іх жыве наш край збяднелы, ціхі,
Перад вачыма васількі цвітуць,
Уваскрасаюць слуцкія ткачыхі,
Што паясы на ўзор персідскі ткуць.

Спі, наш пясняр, ты працаваў так многа!
Спі, не смуткуй, прайшло так многа год...
Твой родны край не выкляты ўжо Богам,
І весела спявае твой народ.

Спі, адпачнуць няхай слабыя грудзі,
Ты не памёр, хоць і пакінуў свет,
Ты будзеш жыць, цябе мы не забудзем,
Ты бессмяротны, дарагі паэт!

## ЛЯ ПОМНІКА ШАЎЧЭНКІ

У сонечнай сталіцы свайго краю
Стаіш ты, заварожаны ў граніт.
І, быццам бы з жывым, я размаўляю
З табою, геній, мар людскіх сяйбіт.

У задуменні ты стаіш і чуеш,
Як новае жыццё бурліць кругом,
Як пад табою сіні Днепр бушуе,
Як твае песні льюцца над Дняпром.

Спакойны будзь, праходзяць хай стагоддзі,
Не выстудзяць тваіх змаганняў жар.
Як у сваім, так і ў маім народзе
Жывым ты застанешся, наш кабзар!

KAMUNIKAT.org

## АБАРВАНАЕ ДАРАВАННЕ

*Памяці замучаных*
*гітлераўцамі яўрэяў*

Шмат перажытага трывала
Памяць да сёння захавала.
Помню, мой сябра Вернік Шыя,
Танец якому быў стыхіяй,
Нават у школьны клас на ўрокі
Ўваходзіў танцавальным крокам.
Цудоўны быў танцор-мастак!
Полька, лявоніха, казак
Выконваліся без памылак
З натхненнем, грацыяй, пачуццём.
Вайна, на жаль, зусім спыніла
не толькі талент, а й жыццё.
Як сёння, помню, ў канцы лета
Ліквідавалі немцы гета
І стомленых яўрэяў многа
Вялі ў апошнюю дарогу.
Ішлі дарослыя, малыя...
Ў калоне я прыкмеціў Шыю.
Мне сэрца сціснулася болем
Ад жахаў, што няcла няволя.
У такт павольных Шыі крокаў
Слязінкі капалі на шчокі.
Трагічны лёс – нагам занозай,
Ім рытміку забралі слёзы.

## РАЙСК

*Памяці 149 жыхароў Райска*
*расстраляных гітлераўцамі*
*16.VI.1942 г.*
*за супрацоўніцтва з партызанамі.*

Райск – нічога супольнага з раем.
Быў найгоршага пекла здзяйсненнем.
Тут фашыстаў навала ліхая
Смерць пасеяла поўнай жменяй.

Колькі жсэрцаў тут спынены стукат!
Вёска згладжана, пушчана з дымам.
Нат камені тут вырваны з бруку
Праз нянавісць да нашай радзімы.

Жыццяя вораг найгоршы не знішчыць,
Жыцця смерцю ніхто не падменіць.
Адрадзілася зноў з папялішчаў
Вёска Райск, як услаўлены фенікс.

Прамінулі няшчасці, пакуты,
Гаспадарацъ загінуўшых дзеці.
Ды нянавісць да ворагаў лютых
Панясуць пакаленні ў сталецці.

kamunikat.org

## ЗАКЛЯТЫ Ў КАМЕНІ

На ўсзодах банка Сумітома –
Як барэльеф – людскі адбітак.
Тут чалавек прысеў адстомы
І не падняўся больш з граніту.

Гарачынёю немагчымай
Яго стапіў з гранітам атам.
Як помнік – сімвал Хірасімы –
Ён дрэмле, ў лесвіцы закляты.
Гаворыць быццам ён: ,,Прахожы,
Глядзі і пільным будзь заўсёды.
Цябе закляць таксама можа
Атам у каменныя ўсходы”.

## СУМЛЕННЕ

*Пілот, які скінуў атамную бомбу*
*на Хірасіму, звар'яцеў.*

Скажы нам, маёр Этэрлей,
Ці ведаў заўчасна, што згіне
Сто тысяч нявінных людзей
Ад бомбы, якую ты скінеш?

Ці ведаў? – здаецца наўрад,
Які лёс вязеш Хірасіме.
Ты толькі выконваў загад
Улад пераможнай радзімы.

Пазней, пасля ўсіх перамог,
Чытаў не ў адной ты газеце:
,,Ніхто яшчэ ўбачыць не мог
Няшчасця такога на свеце”.

З тых пор аж да сённяшніх дзён
Спакойным ніяк быць не можаш.
Цябе, маёр, нават праз сон
Дзяцей крык нявінных трывожыць.

KAMUNIKAT.org

Гаворадь, што ты звар’яцеў,
Баішся свайго нават ценю.
Забойцай ты быць не хацеў,
Таму цябе мучыць сумленне.

KAMUNIKAT.org

## БЯРОЗА І САЛДАТ

У баі бязлітасным граната
Пад бярозай раніла салдата.
Кроў, што не стрымалася ў вене,
Дрэва ўвабрала ў карэнні.

А з галін параненай бярозы
Пацяклі на твар салдата слёзы.
Заспакоілі салдату смагу,
За крыві даніну, за адвагу.

## НІКОЛІ БОЛЬШ ВАЙНЫ

Завецца звычана: Хісако Нагата,
З Японіі родам, год дваццаць адзін.
Яна – дэлегат на маскоўскае свята,
Як я, як сябры мае з розных краін.

Хоць ціхенькі голас Нагаты Хісако,
Усе сэнс разумеюць яе сумных слоў.
Пра горад свой родны, пра дом ў Нагасакі
Гаворыць дзяўчына да новых сяброў.

З агню яе вынеслі ледзьве жывую,
Ад згубных праменняў і голас прапаў,
Бацькоў яе, брата, сястрычку малую
Страшэнны ўзрыў атамнай бомбы забраў.

Хоць ціха гаворыць Нагата Хісако,
Яе словы сёння усюды чутны:
Ніколі больш гібельных дзён Нагасакі,
Ніколі больш атамных бомб і вайны!

## НАЛЕЖНЫ РАНГ

*Прафесар*
*А.Абрэмбскай-Яблонскай*
*прысвячаю*

Варшава,
старыя муры
святыні навукі.
Тут
сотні год
розных моў гукі
вывучалі старанна
за студэнцкай партай.
Ды толькі
да гэтай пары
не гучалі тут словы
роднай
маёй
беларускае мовы,
якой праз вякі
пагарджалі упарта.
А сёння
калі у нябыт
ідзе час нязгоды,
калі спалучае
сяброўства народы,
правы атрымаў
той
хто быў пагарджаны.

Таму вось
паляк, беларус
тут
у сталіцы,
мовы маёй
вывучаюць крыніцы.
Мова зближае
і вучыць пашаны.

KAMUNIKAT.org

## ЛЯЦІ, МАЯ ПЕСНЯ

*Міхасю Забэйдзе Суміцкаму*
*прысвячаю*

Чароўных роднай песні слоў
Не загубілі нават межы:
Яна вярнулася ізноў
З далёкай Прагі ў Белавежу.

Дзе толькі велічны, з агнём,
Плыў мілагучны голас звонкі,
Заўсёды разам з Міхасём
Спявала родная старонка.

Журчаў ляніва ручаёк,
Аб нечым пушча гаманіла,
Граў на жалнйцы пастушок,
Плыў шчэбет птушак лёгкакрылых...

Дык хай далей чулліва так
Старонку родную ўслаўляе
Заўсёды малады мастак
І яго песня маладая.

## МАЯКІ

*Кастусю Майсеню*
*прысвячаю*

У гушчы згорбленых хацін
Красуюць новыя будынкі,
Смяюцца шыбамі вітрын
І шэра-белым свежым тынкам.

Дзівуецца сівы Андрэй:
Вось як прыемна ягамосці,
Хадзілі ў горад мы раней,
А ён да нас прыйшоў у госці.

Быццам марскія маякі,
Ноччу святлом яскравым свецяць
Аб'екты здольнае рукі –
Крамы у Гайнаўскім павеце.

KAMUNIKAT.org

## ЖЫЦЦЁВЫЯ СЦЕЖКІ

Ад шумлівай маёй Белавежы,
Ад хаціны сасновай бацькоў
Я праўшоў у жыцці многа сцежак,
Ды гатоў у дарогу ізноў.

На жыццёвых сваіх каляінах
Шукаў сэрца, людской дабраты,
І знайшоў іх у родных мясцінах,
Таму родны куток мне святы.

А калі ужо стомяцца ногі
Пасля многіх жыццёвых трывог,
Хай апошняя сцежка-дарога
Прывядзе на бацькоўскі парог.

KAMUNIKAT.org

# К О Т
# М У Р Л Ы К А

KAMUNIKAT.org

## ВУЧЫСЯ, МОЙ ДРУЖА

Вучыса настойліва, многа –
Пазнаеш навукі сакрэт
І пойдзеш шырокай дарогай
У надта цікавы наш свет.

Навука паможа талкова
Пазнаць жыцця кожны дзянёк,
Цаніць сваю родную мову
І родны бацькоўскі куток.

Вучыся, тваёю сяброўкай
Няхай кніжка будзе заўжды.
Навука – жыццёвай пуцёўкай –
Умела вядзе праз гады.

KAMUNIKAT.org

## МАКАР І БУКВАР

У кнігарні Макар
Купіў новы буквар
І ў школу бягом
Паімчаў з букварам.
Там, як цвёрды граніт,
Шліфаваў алфавіт.
І надзвычай быў рад,
Як злажыў з літар склад.
Потым ён са складоў
Збудаваў многа слоў,
А са слоў у свой час
Утварыўся і сказ.
Сказ такі меў сакрэт,
Што вёў вучняў у свет.
Макару многа мар
Здзейсніў гэты буквар.

KAMUNIKAT.org

## РУПЛІВАЯ ДАЧУШКА

Лідачка штодзень у хаце
Памагае ў працы маці.
Падмяце пакой прыгожа,
З густам свой пасцеле ложак,
Прынясе вады вядзерца,
Снедаць дасць маленькай Верцы.
Выпрасуе свой каўнерык,
Ранец з кніжкамі праверыць,
І з усмешкаю вясёлай
Пабяжыць тады ўжо ў школу.
- Вось дык слаўная дачуся, -
Не нахваліццв мамуся.
- Ленавацца надта брыдка, -
Пераконвае ўсіх Лідка.

KAMUNIKAT.org

## УРОК І КАТОК

З ілба рукой змахнуўшы пот,
Сынок звяртаецца да маці:
- Чаму спакойна дрэмле кот,
А я штодзень працую ў хаце?

Не вытрымаў малы каток
І мяўканнем адказ даў Грышу:
- Зраблю я за цябе урок,
Ты за мяне паловіш мышы!

Шмат часу Грыша-мышалоў
Нёс варту над мышынай норкай.
Сказаў: - Я горшы ад катоў, -
І ледзь- ледзь не заплакаў горка.

З тых пор ён разважае так:
- Мне ленавацца больш не трэба.
Малы каток і то аднак
Працуе на кавалак хлеба.

**САШКА І МУРАШКА**

Сашка са школы ўцёк з заняткаў –
Страшэнны быў з яго гультай.
Каб не сустрэцца з бацькам, маткай,
Пабег у навакольны гай.

У гаі знайшоўшыся наш Сашка
Сярод ялін густых прылёг
І прыглядаўся, як мурашка
Паўзла ля брудных яго ног.

Мурашцы цяжка узбірацца
На горку з доўгім бервяном –
Спадала з горкі разоў дваццаць,
За дваццаць першым – пералом!

- Вось дзе заўзятасць, - думаў Сашка
І да сябе зрабіў намёк:
- Мурашка так працуе цяжка,
А я, гультай, са школы ўцёк.

З тае пары ўжо ён ніколі
З урокаў не ўцякае ўгай.
Ён працавіты вельмі ў школе
І па-за школай не гультай.

KAMUNIKAT.org

## ЯРАСЛАЎ СУП ЗГАТАВАЎ

Сёння ў полі бацька, маці,
Яраслаў адзін ў хаце.
Дык падумаў: - Так і быць,
Трэба нешта ім зварыць!
Крыху бульбы, крыху круп –
На вячэру будзе суп.
Многа Славік натрудзіўса,
Покуль суп яго зварыўся.
Хоць варыў яго дзень цэлы,
Хоць і быў суп прыгарэлы,
Хоць і горкі быў да болю,
Хоць і меў за многа солі,
Хоць і бульбіны ў мундзірах, -
Працаваў хлапчына шчыра:
Мама кажа: Вось на славу
Суп зварыў сыночак Славік.

KAMUNIKAT.org

## ПРАЦАВІТЫ ТЫДЗЕНЬ

Памагала так умела
Гэля маме ў панядзелак.
А цалюткі дзень аўторак
Правяла ля бабкі хворай.
Як настала серада,
Тата працу ў садзе даў.
Шыла беленькі каўнер
Да сукенкі у чацьвер.
Віншавалі ў пятніцу
У школе выдатніцу.
Як заўсёды, у суботу
Дома шмат было работы.
А ў святочную нядзелю
Надта ўсе хвалілі Гэлю.

KAMUNIKAT.org

## ВОСЬ ДЫК ГЭТА БЫЎ ШЧУПАК

Сядзіць Янка ля ракі,
Закідае вуду.
Сняцца хлопцу шчупакі
Проста на паўпуда.
А папаўся на кручок
Невялічкі шчупачок.
Наш рыбак тут, рад-не рад,
Адпусціў яго назад.
Нехта з Янкавых сяброў
Запытаўся пра ўлоў.
А наш Янка кажа так:
- Вось дык гэта быў шчупак!
Велізарны, як вяпрук, -
Не ўтрымаў яго мой крук!

## ЕЗДЗІЎ ФЕДЗЯ НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ

Тата Федзю рана будзіць,
Пачынае з ім гаворку:
- Ты веласіпед мець будзеш
За навуку на пяцёркі.

Неўзабаве просіць тату
Да сябе настаўнік Лойка.
Кажа: - З Федзяй слабавата,
Атрымоўвае ён двойкі.

Надта тата расхадзіўся...
- Што рабіў? – пытае Федзю.
– Дык я, татачка, вучыўся...
Ездзіць на веласіпедзе.

KAMUNIKAT.org

## ЧАКАЎ НА АПОШНІ ЗВАНОК

Тата пытаецца ў Колі:
- Што ты рабіў сёння ў школе?
Адказывае таце сынок:
- Чакаў на апошні званок.

KAMUNIKAT.org

## ІВАН УВОДЗІЦЬ БАЛАГАН

Толькі з ложка ўстаў Іван,
Распачаўся балаган.
Дзе кашуля, дзе штаны,
Дзе падзеліся яны?
Як на злосць таксама знік
Неслухмяны чаравік.
- Можа хтосьці шапку бачыў? –
Ваня ўсіх пытае з плачам.
Цэлая сям'я шукае,
Нават Зіначка малая.
Аглядаецца матуля,
Дзе ж падзелася кашуля?
З ложка паднялася бабка
І шукае Вані шапку.
Як адзеўся нейк на сілу,
Снедаць часу не хапіла.
І спазніўся на ўрок
Неслухмяны той сынок.
Ну, а заўтра зноў Іван
Зробіць дома балаган.

KAMUNIKAT.org

**ПЕЦЬКА ЗАПЭЦКАН**

Бабулька просіць свайго ўнука:
- Ты, Пецька, першза ўсё як след
Памыў старанна свае рукі,
А потым сядзеш за абед.
Дык я, бабулька, мыць не буду,
Таму што мне вады шкада.
Я маю на руках шмат бруду,
А друк пабрудзіцца вада.

KAMUNIKAT.org

## ЛЯНОТА

Ледзь цягнуў у школу ногі
Абібок, гультай Цімошка.
Перайшла яму дарогу
Чорная, як вугаль, кошка.

- Тут бяда ўжо недалёка,
Думаў Цімка-небарака.
Сапраўды ён на ўроках
Дрэнныя злавіў адзнакі.

З двойкамі па трох прадметах
Ён дамоў адважна крочыў.
Ці ж яго віна ў гэтым,
Што кашэчы зрок сурочыў?

- Не хлусі ты, - кажа тата,
Лепш вазьміся за работу.
Тут не кошка вінавата,
А твая, сынок, лянота.

KAMUNIKAT.org

## ЯК ТУТ НЕ ПАЗНІЦЦА

Жыў ад школы недалёка
Гарэза Валодзя,
Ды пазніўся на ўрокі,
Хоць рана выходзіў.

Калі раніцаю з хаты,
Выйшаў забіяка,
Па дарозе на пачатак
Падражніў сабаку.

Потым ён у агароды
Шмыгнуў пажывіцца.
Нарабіў там многа шкоды,
Як найгоршы гіцаль.

Нечакана ў сад, як злодзей,
Ён палез па грушы.
Гаспадар злавіў Валодзю,
Накруціў за вушы.

KAMUNIKAT.org

Паімчаў за нейкім возам,
Хоча ўчапіцца...
Шмат спраў розных па дарозе,
Як тут не спазніцца!

KAMUNIKAT.org

## СЯДЗІЦЬ КОЛЯ НА ТАПОЛІ

- Я адважны, - кажа Коля, -
Хутка ўлезу на таполю.
Ён з галіны на галіну.
Узабраўся на вяршыню.
Як зірнуў уніз на хату –
Уцякла адвага ў пяты.
Горка плача хвалько Коля,
Абдымаючы таполю:
- Ой, знімі мяне, мамуся,
Бо я злезці сам баюся.

KAMUNIKAT.org

## ЯРАСЛАЎ ШТАНЫ ПАДРАЎ

Мама пачала сварыцца:
- Дзе падраў ты нагавіцы?
Ад сынка пачула матка:
- Я займаўся фіззарадкай.
У крытычную хвіліну
Не ўтрымаўся на галінах.
З дрэва падаў стрымгалоў
Аб сук порткі распароў.
І чаму ж тады дзівіцца
Што падраны нагавіцы?

KAMUNIKAT.org

**ЛЯВОН З ВАЧЭЙ ЗМЯТАЕ СОН**

Матуля пытае сыночка:
- Чаму ты рукамі трэш вочкі?
Адказвае маме Лявон:
- Змятаю з вачэй сваіх сон.

KAMUNIKAT.org

## ВОЖЫК

Напужаў Сярожу
Невялічкі вожык,
Які адвячоркам
Крочыў панадворкам.
Смяецца бабуся:
Ён цябе не ўкусіць
Смела ўзяў хлапчына
Вожыка за спіну,
Той яму заўзята
Скалоў ручаняты.
Заплакаў Сярожа,
Што калючы вожык.
Бабка кажа ўнучку:
- Не чапай калючкі.

KAMUNIKAT.org

## ПАТАНУЛІ Ў РЭЧЦЫ ЗОРКІ

Сонца скрылася. Змярканне.
Бабка спіць на печцы.
З хаты вырваўшыся, Ваня,
Мігам быў на рэчцы.

Прыбягае да бабулі
Раптам з плачам горкім:
- Бабка, бабка, патанулі
Ў нашай рэчцы зоркі.

KAMUNIKAT.org

**АЎТАМАТЫ**

- Прыйдзе, - кажа тата, -
Неўзабаве час,
Будуць аўтаматы
Працаваць за нас.

Уздыхнуў з палёгкай
Абібок Ігнат:
- За мяне урокі
Зробіць аўтамат!

KAMUNIKAT.org

## КАСМАНАЎТ

Міхась надакучаў тым:
- Хачу быць касманаўтам.
Даўно аб тым я мару,
Каб лётаць, як Гагарын.
Гатовы я ў дарогу.
Адвагі маю многа,
Ніколі не хварэю,
Чытаць крышку ўжо ўмею.
Хоць толькі год мне восьмы,
Магу ляцець у космас.
Бяда аднак у гэтым –
Не маю я ракеты.

KAMUNIKAT.org

## КАЛЯРОВЫ ЗМЕЙ

Каляровы,
Папяровы
Змей ляціць высока.
І Валодзя,
Што з ім ходзіць,
Траціць змея з вока.
- Гэй, хадзіце,
Коля, Віця,
Уважна глядзіце:
Змей мой новы,
Каляровы
Пэўна на арбіце!

KAMUNIKAT.org

## СКАЖЫ, ЦІ ДРЭЎЦА ПАСАДЗІЎ ТЫ?

Напэўна, час дажджу ці спёкі,
Пад дрэва кронаю шырокай
Спыніцца любіш, потам зліты.
Скажы, а дрэўца пасадзіў ты?

Любіш ісці такой дарогай,
Дзе паабапал дрэваў многа.
Любіш. Таму вось менавіта
Скажы, ці дрэўца пасадзіў ты?

Гоман і мілы спеў птушыны,
Што рэхам льецца па галінах,
Ловіш заўсёды прагавіта.
Скажы, а дрэўца пасадзіў ты?

Прыемна, згодзен я з табою –
Ў садзе асеннюю парою
Спажыць шмат фруктаў сакавітых.
А дрэўца, дружа, пасадзіў ты?

KAMUNIKAT.org

Любіш ты апынуцца ў гушчы
Вялікай, шматвяковай пушчы.
Быць ад малін ці ягад сытым.
Скажы, а дрэўца пасадзіў ты?

Жывеш штодзённа, мілы браце,
У смаляной драўлянай хаце.
Твой стол і ложак з дошак збіты.
Скажы, а дрэўца пасадзіў ты?

У навагодні дзень святочны
У тваім доме, відавочна,
Ёлка з'яўляецца з візітам.
Скажы, а дрэўца пасадзіў ты?

KAMUNIKAT.org

## КОЦІКІ ВЯРБОВЫЯ

Пеця ціха з хаты знік,
Сёння – восьмы сакавік.
З чым жа я вярнуся
Віншаваць мамусю?
Стары дзядька Яраслаў
Вось якую раду даў:
- На вярбе шмат коцікаў,
Жоўценькіх жывоцікаў.
Трэба толькі іх сабраць,
З імі маму віншаваць.
Хутка наш малы герой
Апынуўся пад вярбой.
Дзе ж вы, мае коцікі,
Жоўтыя жывоцікі?
Дзе вас, коцікі, шукаць,
Як мне маму прывітаць?
Смяюцца дзяўчынкі:
- Глянь – вось на галінках,
Жоўтыя, пуховыя
Коцікі вярбовыя.

KAMUNIKAT.org

## ШПАКОЎНІ

Ярка сонца засвяціла,
Знікнуў лёд з ракі.
Прыняслі ўсады на крылах
Нам вясну шпакі.

Веснавы прастор напоўніў
Птушак звонкі спеў.
Хлопцы ўладзілі шпакоўні
На галінах дрэў.

Вось спраўляюць навасельле
Птушкі тут і там.
І удзячных многа трэляў
Шлюць будаўнікам.

KAMUNIKAT.org

## ГРАДКІ

Выдзяліла матка
Ганулі дзве градкі.
На градках Гануля
Садзіла цыбулю,
А таксама трошкі
Фасолі. гарошку,
Пятрушкі, шпінату,
Радыскі, салаты,
Памідораў, агуркоў,
Маку, морквы, буракоў.
Хоць было ўжо густа –
Яшчэ і капусты.
Але градкі летам
Занядбала гэтак,
Што вітаў яе асот,
Як прыйшла ў агарод.

KAMUNIKAT.org

## КУРКА ЧУБАТКА І ГУСЯНЯТКІ

Пасадзіла цётка Майка
Курку на гусіных яйках.
Неўзабаве было шмат
Невялічкіх гусянят.
З жоўтадзюбай чарадой
Ходзіць курка над ракой.
Курка берагам ідзе
Гусяняты ўсе ў вадзе!
Дзівяць курку без канца -
У ваду даюць нырца:
- Гляньце, што за дзівакі,
Не пужаюцца ракі.
Курка плача: Ко-ка, ко-ка!
У рацэ вада глыбока.
У вадзе мае малюткі
Патапіцца могуць хутка.
Не ведае чубатка,
Што гэта гусяняткі.

KAMUNIKAT.org

## КОТ І МЫШКА

Кот-мурлыка злавіў мышку,
Заўжды ён любіў сваволіць,
І, крануўшы лапкай крышку,
Мышку адпусціў на волю.

Бедная што ў ножках сілы
Уцякае ад нялюба..
Не на доўга свет быў мілы –
Зноў кату папала ў зубы.

Кот пусціў яе памалу,
Мышка раптам стрэла норку,
Шмыганула і прапала.
Кот-мурлыка плача горка.

KAMUNIKAT.org

## СТАНОЖКА

Мае сотню ног станожка,
І хаця спяшаецца,
Ножкі ўсе ідуць пад ножку –
І не памыляюцца.

Дзіваваўся надта Пеця,
Як у жыцці здараецца:
Выйдуць з класа маршам дзеці –
Ногі ім блытаюцца.

KAMUNIKAT.org

**КРОТ**

Многа падзямельных грот
Нарабіў маленькі крот.
З жонкаю пакояў пяць
Добра змог абсталяваць,
Шмат пакояў для дзяцей,
Шмат прыёмных для гасцей,
Шмат кладовак пад запас,
Дзецям – школьнікам даў клас.
Многа збудаваў дарог,
Каб даехаць кожны мог.
Спахапіўся раптам ён,
Што няма нідзе акон.

KAMUNIKAT.org

## КОТ-АБЖОРА

Да сала ў каморы
Дахрапаўся коцік.
Ляжыць цяпер хворы,
Уздуўся жывоцік.

Прыйшоў за хвіліну
Пан доктар кашэчы:
- Ты хворы мой сыну?
Дык трэба палечыць.

Баліць, кажаш, бруха,
Зрабіўся ты хворы.
Парады паслухай:
Не будзь больш абжорай!

KAMUNIKAT.org

## ХТО КАМУ БОЛЬШ ДАПЯЧЭ?

Доўгатрывалы летні жар
Усім шмат надакучыў.
Прысеў нат адпачыць камар
На крапіве пякучай.

Не зводзіць з камара вачэй
Дасціпны надта Славік.
Хто тут каму больш дапячэ? –
Даведацца цікава.

KAMUNIKAT.org

## ПАВУЧОК

Невялічкі павучок
Цёмны вынайшоў куток
І падумаў: - Зраблю сецць,
Мушка можа прыляцець.
На красенцах доўга ткаў,
Доўга муху пільнаваў.
І аднойчы чуе ён
Мухі горкі плач і стогн.
Муха просіць: - Павучок,
Адпусці мяне, браток.
- Не на тое сець я ткаў,
Каб цябе я ратаваў, -
Горда адказаў павук.
І тут мусе быў каюк.

KAMUNIKAT.org

## ВЯСНУШКІ

Ад малых год мае Жэня
Поўны тварык рабацення.
Нат на носіку і вушках
Размясціліся вяснушкі.
Дзеці ў школе празываюць
Жэню найчасцей ,,рабая”.
Больш прыстойную мянушку
Жэні надалі: - ,,вяснушка”.
Нехта нат прыдумаў лоўка:
,,Жэня – божая кароўка”.
І злуе заўсёды Жэня
На дзяцей, на рабаценне.
Жэня марыць: - Неяк мушу
Вызваліцца ад вяснушак.
А ўсапраўднасці у Жэні
Тварык мілы ў рабаценні.

KAMUNIKAT.org

## ЦІ ПАДРОС Я, ТАТА?

Пагаворку адмыслову
Чуў не раз малы Ігнат:
,,Як намочыць дождж маёвы,
Падрасцеш адразу шмат”.

Ён убег з дажджу у хату,
Ручайкі плывуць з валос
Ад парога кліча тату:
- Тата, глянь, ці я падрос?

KAMUNIKAT.org

## МІКОЛКА І ПЧОЛКА

Заглянуў аднойчы ў вулей
Цікаўны Міколка.
Бяжыць з плачам да бабулі:
- Укусіла пчолка.

Праняўшыся ўнучка лёсам,
Бабка раіць Колю:
- Дзе не трэба, не сунь носа,
Не будзеш мець болю.

KAMUNIKAT.org

## ЛЯСНЫЯ ДАКТАРЫ

Пук-пук, стук-стук, пук-пук,
Сасна, бяроза, бук
Хварэюць у бары,
А мы – іх дактары.
Нас, дзятляў- дактароў,
Тут шмат паміж ствалоў.
Мы даглядаем бор,
Каб хтосьці не памёр.
Калі хто хворы з вас,
Дык пазавіце нас.
Злых шкоднікаў з кары
Вам вымуць дактары.

KAMUNIKAT.org

## ЯКАЯ НАЙЛЕПШАЯ ПАРА

Шукаў Сярожа зводак
У змесце буквара,
Якая будзе года
Найлепшая пара?

Нам залатая восень
Нясе ўраджаю шмат.
Да спелых фруктаў просіць
Багатая клець – сад.

Уцехі колькі ўзімку,
Як белы ўсцяж прастор,
Сняжынкі-балярынкі
Завуць дзяцей на двор.

Прыемна надта ўвесну,
Калі сады цвітуць
І птушак трэлі-песні
Па-над зямлёй плывуць.

А як жа многа ўлетку
Прыгожае красы,
Як спеюць на палетках
Азімін каласы.

Даведаўся Сярожа
Са зместу буквара:
Аднолькава прыгожай
Ёсць кожная пара.

KAMUNIKAT.org

## ХОДЗЯЦЬ МЕСЯЦЫ ПА СВЕЦЕ

### СТУДЗЕНЬ

Студзіць, студзіць
Месяц студзень.
На санках мароз
Новы Год прывёз.

### ЛЮТЫ

Едзе марозны люты –
Адзеты будзь, абуты!
Яго магутны крок
Даносіцца здалёк.

### САКАВІК

Сакавік, сакавік,
Набраў вады ў чаравік.
Снег лужамі плача:
Мой канец, няйначай...

KAMUNIKAT.org

КРАСАВІК

Толькі глянуў красавік,
Снег апошні цалкам знік.
Шле вясна сваю красу,
Расплятаючы касу.

МАЙ

Май, прыгожы май,
Луг уквеціў, гай.
І з галінак дрэў
Сыпле птушак спеў.

ЧЭРВЕНЬ

Чэрвень, чэрвень –
Зелень, чырвань.
Песціць зямлю сонца.
Цеплынёй бясконцай

ЛІПЕНЬ

Месяц летні ліпень
Сее водар ліпы
І на нівах спеліць
Збожжа ля аселіц.

KAMUNIKAT.org

ЖНІВЕНЬ

Ураджайны жнівень
Выехаў на нівы
І праводзіць дбайна
Ён жніво камбайнам.

ВЕРАСЕНЬ

Клапатлівы верасень
Апрануўся верасам.
Ён прынёс у сад
Свежых фруктаў шмат.

КАСТРЫЧНІК

Зашумеў кастрыцай
Асенні кастрычнік,
На кашулі ён
Трэпле жоўты лён.

ЛІСТАПАД

Сумны лістапад
Агаліў лес, сад.
Апошні лісток
На галіне змок.

## СНЕЖАНЬ

Снежань, снежань –
Сняжок свежы
Сыпнула зіма.
Сумаваць дарма!

KAMUNIKAT.org

## ХТО ПАМАЛЯВАЎ ЛІСТЫ?

Зося ведала, што клёны
Летам мелі ліст зялёны.
Раптам бачыць, што лісты
Маюць колер залаты.
І дадумацца не можа,
Хто малюе так прыгожа.
Растлумачыў тата Зосі,
Што лісты малюе восень.

KAMUNIKAT.org

**ВОСЕНЬ**

Дажджлівыя дзянёчкі
Прынеслі суму многа.
Пажоўклыя лісточкі
З дрэў сцелюцца пад ногі.

Сумуюць каля тыну
Маўклівыя бярозы.
Ім кроплі па галінах
Сплываюць, быццам слёзы.

Адна толькі рабіна
Стаіць на панадворку,
Прыгожа, як дзяўчына,
Ў чырвоненькіх пацёрках.

KAMUNIKAT.org

## ЗАДАВАКА-БАРАВІК

Задавака-баравік
Хваліўся ўсім навокал:
- Я ў мох хавацца не прывык
Перад прахожых вокам.

Як толькі вызірнуў грыбок,
Наткнуўся на Алёшу.
А той схапіў яго за бок –
І палажыў у кошык.

KAMUNIKAT.org

**РЭХА**

З татам Саша ў лес паехаў
І пачуў у лесе рэха,
Вырашыў: абавязкова
Рэха ў цёмным лесе зловіць.
Ўжо, здавалася хлапчыне,
Рэха села на галіне.
Толькі ён прыспешыў кроку –
Рэха зноў было далёка.
Тата кажа: - Мой Алесю,
Ты не зловіш рэха ў лесе.

KAMUNIKAT.org

## МУХАМОР

- Я прыгажун на цэлы бор, -
Хваліўся рослы мухамор.
- Ці паказаць вы мне маглі б
Другой такі прыгожы грыб?
Коўзкі, мізэрненькі масляк
Яму на гэта кажа так:
- Хоць дасканалы твой убор,
Ды ты атрута – мухамор.

KAMUNIKAT.org

## ЗІМА

Прыгожыя сняжынкі
Ў паветры зімнім ўюцца,
На шэрых дрэў галінках
Раўнюсенька кладуцца.

Наскрозь зямля –старэча
Празябнула зімою,
Накрыла свае плечы
Пярынай снегавою.

У полі птушанияткі
Дрыжаць, як ліст бярозкі,
Шукаюць сабе хаткі
Ў зацішшы нашай вёскі.

Ды толькі Стась, Ягорка,
Марозу не баяцца,
Стралой імчаць на горку –
На санках пакатацца.

KAMUNIKAT.org

**ЁЛКА**

На санках Міколка
Ў сцюдзёны мароз
Зялёную ёлку
Дахаты прывёз.

У цацкі прыбрана,
Прынесла з сабой
Пах лесу духмяны,
Святочны настрой.

І хоць мароз колкі,
На шыбінах лёд,
Прыемна так з ёлкай
Сустрэць Новы год

KAMUNIKAT.org

## ДЗІЎНЫ МАСТАК

Як прачнуўся Коля рана,
Праз акно зірнуў на двор:
Дык здзівіўся - маляваны
Шыбы ў разнастайны ўзор.

Як тут многа прыгажосці!
Хто ж памаляваць мог так?
Быў відаць тут нашым госцем,
Нейкі вопытны мастак.

- Быў мастак тут, - кажа мама,
Фарбаў срэбных шмат прынёс.
З барадою ён, вусамі,
А завуць яго – мароз.

KAMUNIKAT.org

**БАРАДА**

Пытае Ваня: - Дзеду мой,
Чаму ты ходзіш з барадой?
Сказаў на гэта дзед Андрэй:
- Мне з барадою шмат цяплей.
Аднойчы зімняю парой
На лёд бег Ваня з дзетварой,
Яго за шчокі і за нос
Балюча браў сівы мароз.
Падумаў Ваня: - Як шкада,
Што не расце шчэ барада.

KAMUNIKAT.org

## КАРМУШКІ

Халадэча. Мерзнуць птушкі
Ля вясковых хат.
Дзеці прыняслі кармушкі,
Сыпнулі зярнят.

Ешце, птушкі-весялушкі,
Шчыра просім вас.
А вясною нам, пяюшкі,
Услаўляйце час.

KAMUNIKAT.org

## ЛЯНІВАЯ ВАВЁРКА

\- Доля ж мая, доля горка, -
Скардзіцца ў дупле вавёрка. –
Я запасаў не прыдбала,
А тут так пахаладала.
Грозная зіма з марозам
Выціскае з вачэй слёзы.
\- Бачыш, - кажа ёй суседка,
Ты не працавала ўлетку
Дык цяпер, мая сястрыца,
Кладзі зубы на паліцу.

KAMUNIKAT.org

## КОЦІК-БЯЗБОЦІК

Кот праз акно ў халоднай хаце
Першы раз снег ў жыцці ўбачыў.
Марыў: - Пад гэтаю пярынкай
Я абагрэю лапкі, спінку.
Выбег без ботаў і без шапкі –
І адмарозіў вушы, лапкі.
Хворы ён сеў на бераг печы,
Аплакваючы лёс кашэчы.
Дзяўчынка просіць: -Не плач, коцік,
Я ўжо пашыла адзін боцік
Хутка табе дам боты, шапку,
Не будуць мерзнуць вушы, лапкі.

KAMUNIKAT.org

**ДАЛЁКА ДА СОНЦА**

Мама вымыла кашулю
І сказала малой доньцы:
- Даражэнькая Ганул я,
Ты павесь яе на сонцы.

З недаверам пазірае,
Ганя ў неба сумным зрокам:
- Мама, я ж яшчэ малая,
А да сонца так далёка...

KAMUNIKAT.org

## КАБ ДОБРА СОН УБАЧЫЦЬ

Бабулька ўакулярах
На ложку задрамала.
Маленькая Тамара,
Убачыўшы, сказала:

- Шкляныя бабка вочы
Надзела не іначай
Таму, каб сон уночы
Як мага лепш убачыць.

KAMUNIKAT.org

## СЫНОК І СВІСТОК

У нейкае свята
Маленькі сынок
Звярнуўся да таты:
- Купі мне свісток.

А тата малому
Сказаў: - Сынку мой,
Свістком гэтым дома
Парушыш спакой.

- Спакой меці хочаш, -
- Азваўся малыш, -
Свістаць буду ўночы,
Тады, як ты спіш.

KAMUNIKAT.org

## ПІЛЬНАВАЛА ГАНУЛЯ МАЛАКО Ў КАСТРУЛІ

Мама просіць Ганулю:
- Выйду я на сяло,
Ты пільнуй, каб з каструлі
Малако не ўцякло.

- Добра, - кажа дачуся, -
Ты спакойная будзь.
І бяжыць за мамусяй
На ключ дзверы замкнуць.

Села тут пад дзвярыма
Малако сцерагчы.
Малаку немагчыма
Каб змагло уцячы.

Мама ўжо на парозе:
Крычыць:-Ах, Божа мой,
Малако на падлозе
Разлілося ракой.

KAMUNIKAT.org

- Не журыся, - сказала
Ганя маме ў дакор.-
Каб я не пільнавала,
Уцякло б і на двор.

KAMUNIKAT.org

## ШАРЫКІ

Слоічак знайшоўся ў Мішкі
І саломінка малая,
Крышку мыла, вады крышку –
Бурбалкі ён выдзімае.

Бурбалка расце бясконца,
Вабіць Мішку ў свет чароўны,
Неба ёсць у ім, і сонца,
І шматлікіх дзіваў поўна.

Плыве бурбалка паволі
Ўверх, як надуваны шарык.
Разам з бурбалкай на столі
Расплыліся Мішкі мары.

KAMUNIKAT.org

**МЫШ У ЗБАНЕ**

Звяртаецца рана
Да мамы малыш:
- У збане смятаны
Ўтапілася мыш!

- Дык, пэўна, ты выняў
Мыш гэту, сынок?
- Не, мама, я ўкінуў
Ката у збанок.

KAMUNIKAT.org

## ЧАМУ ВАДА САЛЁНАЯ Ў МОРЫ?

Настаўнік запытаў Рыгора:
- Чаму вада салёна ў моры?
Рыгор на гэта: -Таму хіба?
Каб не псавалася ў ёй рыба.

KAMUNIKAT.org

## ЦІКАЎНЫ СЫНОК

Пытае ў мамачкі Хвядос:
- Чаму наш тата без валос?
Мама сказала наўздагад:
- Наш татачка працуе шмат.
Разумны надта тата твой,
Таму ён з лысай галавой.
- Тады чаму, - спытаў сынок, -
Мама, ў цябе з касы вянок?

## ЦЯГНІК

Ідзе, бяжыць з усіх старон
Шмат пасажыраў на перон,
Кожны нервуецца, сапе,
Насілу тоўпіцца ў купэ.
Падаў спуск пары машыніст,
Прарэзлівы раздаўся свіст,
А на дзяжурнага сігнал
Адплыў назад пусты вакзал.
Наперад з грукатам калёс
Магутны рушыў паравоз,
І за сабою цягне ён
Адзін вагон, другі вагон,
Так многа іх, згубіўся лік,
Вужакай цягнецца цягнік.
Шмат увабраўшы конскіх сіл,
На пасмах двух сталёвых жыл,
Сталёвы разбрыкаўся конь,
Крэша падковамі агонь,
Тах- тах, тах- тах, тах- тах, тах- тах,
Які разгон, які размах,
Імчыць наперад, як віхор,
Хутка паконвае прастор.

Густы страляе ў неба дым.
І вось мы ў горадзе другім.
Ізноў вакзал, ізноў перон,
Людзей натоўп з усіх старон.
А за хвіліну паравоз
Зноў рушыў з грукатам калёс,
І за сабою цягне ён
Адзін вагон, другі вагон,
Так многа іх, згубіўся лік,
Вужакай цягнецца цягнік.

KAMUNIKAT.org

## КАБ ПАЕХАЛА НАМ ХАТА

Першы раз цягнік у горад
Вёз маленькага Рыгора.
Дым, што хлынуў з паравоза,
Выціскаў Рыгорку слёзы.

Калі ён ішоў дадому,
З коміна дымок знаёмы
Лентай плыў па панадворку.
Адазваўся тут Рыгорка:
- Вось было б цікава, тата,
Каб паехала нам хата!

KAMUNIKAT.org

## ТЫ БЫЛА Ў СНЕ ТАКСАМА

Сон такі цікавы
Слава сніў уночы.
Мама просіць Славу:
- Раскажы, сыночак.

- Расказваць не буду,
Дарагая мама,
Ты ж была ўсюды,
Ў гэтым сне таксама.

KAMUNIKAT.org

## МІЛЫ ГНОМ, ДЗЕ ТВОЙ ДОМ?

Бабка баіла Алесю:
- Гномаў шмат жыве у лесе.
Маюць цёплыя капоты,
У чырвоных ходзяць ботах
І каптурыках чырвоных.
З мілых тварыкаў натхнёных
Па грудзях плывуць барод кі.
Колькі ж дабраты салодкай
Маюць у вачах блакітных!
З вякоў даўніх, старажытных
Да сягоння жывуць гномы
І не робяць зла нікому.
- Вось каб з гномамі сустрэцца! –
Алесь марыць, мараць дзеці.
Давялося раз Алесю
Пабываць улетку ў лесе.
Углядаецца кругом,
Мо дзе прытаіўся гном.
Мо дзе глянуць з-пад лісточка
Ясныя, малыя вочкі?

Адгукніся, мілы гном,
Дзе жывеш ты, дзе твой дом?
Растлумачылі малому,
Што жывуць у казках гномы.

KAMUNIKAT.org

## КАНІКУЛЫ

Канікулы, канікулы,
Вясёлы летні час.
Прывабіла, паклікала
К сабе прырода нас.

Краіны нашай вольнае
Нязведаны прастор
Заве ўсю моладзь школьную
Да хваль марскіх, да гор,

Да роўнядзі азёрнае,
Да цішыні лясоў,
Пад небам ночы зорнае
Вандроўніцкіх кастроў,

Пад сонейка праменнямі
Штодзённа загараць,
Бурлівых рэк струменнямі
Дух, цела гартаваць.

KAMUNIKAT.org

Вясёлымі, здаровымі,
Сіл маючы запас,
Да працы зноў гатовымі
Вярнуцца ў школьны клас.

KAMUNIKAT.org

# ВЫБАЧАЙЦЕ,
# КАЛІ ЛАСКА

KAMUNIKAT.org

## ПРЫВІТАЛЬНАЕ СЛОВА

Вітаем стройных і высокіх
І тых, хто рос і не дарос.
Бландзінаў, цёмных, сінявокіх
І тых, зусім ўжо без валос.

Вітаем п’яных з цвярозых,
Што п’юць гарэлку і не п’юць,
І тых, што праліваюць слёзы,
Калі іх замуж не бяруць.

Вітаем тых, хто робіць манка,
Што дакрадаюць ўсім на злосць
І тых, што маюць дзве каханкі,
Калі у хаце жонка ёсць.

Вітаем цвёрдых бюракратаў,
Што без паперкаў праклінуць.
Вітаем халастых, жанатых,
І тых, што з жонкай не жывуць.

Вітаем лянюхоў, неробаў,
Якім – хто робіць – той дурак.
І тых упартых бракаробаў,
Што калі зробяць – заўжды брак.

kamunikat.org

Вітаем тых, што бяруць ўзяткі,
І тых, што хабар даюць ім.
І тых, што ўсё ідзе ім гладка,
Калі пайшлі на падхалім.

Вітаем лютых кар'ерыстаў,
Што коштам іншых хочуць жыць,
І тых, што нават ў вадзе чыстай
Знаходзяць нешта памуціць.

Усім гаворым мы: - Вітайце! –
Старым, дарослым і малым,
Ды толькі на прыкмеце майце
Не аднаго жадаем ўсім:

Цвярозым – век пражыць цвяроза,
Малым расці, худым таўсцець,
Плачлівым – каб не лілі слёзы.
Жанчынам – заўжды маладзець.

А тым, што выплакалі вочы,
Валос баючыся сівых,
Каб ім змяніў іх стан дзявочы
Хоць бы вырадлівы жаніх.

Тым, што па сцёках ходзяць ракам,
Дамоў не могуць завітаць,
Жадаем, каб у „Матысякаў"
Маглі часценька начаваць.

А лізунам каб на аршыны
Язык мог мяккі адрастаць,
Каб на рабоце ўсе гадзіны
Маглі каго трэба лізаць.

Тым, што на хабар надта ласы,
На манках хочуць багацець,
Жадаем, каб хоць час ад часу
Маглі дзе трэба пасядзець.

А бюракратам, што як п'яўкі,
Ўсім прычыняюць многа бед,
Каб на пісьмовыя заяўкі
Варылі жонкі ім абед.

Усім, каго мы закранулі,
Яшчэ раз хочам пажадаць,
Таб людзі не патрабавалі
На іх адгэтуль наракаць.

KAMUNIKAT.org

## ВОСЬ ЯК РОЎНА ДЗЕСЯЦЬ ГОД ЯНЫ КРОЧЫЛІ Ў НАРОД

Першым Сашка Давідзюк
Шліфаваў вясковы брук.
А за ім да нашых сёл
Крочыў Аляксей Казёл.
Трэцім зведаў палёў шыр
Наш Станкевіч Ўладзімір.
За Станкевічам услед
Паімчаўся Віктар Швед.
- Мераць гразь – вось гэта брыда, -
Чулі ад Бялецкай Ліды.
За Бялецкай праз папар
Дзем'яновіч бег Макар.
А Хмялеўскі Міхасёк
Па дарозе мерзнуў, мок,
Не шкадуючы ног, рук,
Як і Ўладзімір Юзвюк.
Наглядаў за ўсімі звонку
Рэвізор Хведар Галёнка.
Ў „Ніве" Валкавыцкі Юры
Славіў дзеячоў культуры.
Прамінула дзесяць год,
Як ішлі яны ў народ.
Хто ж адправіцца далей
Лавіць новы юбілей?

**МЫ ВЯСКОВЫ ЛЮД ЗДАРОВЫ**

Кажуць нам:,,Не едзьце ў горад,
Там надзвычай многа хворых,
Там шалее грозны грып -
Вы набрацца там маглі б”.

А ў нашай вёсцы Грыпа
Сорак год жыве з Архіпам,
І, хоць ён стары, як грыб,
Не хварэе наш Архіп.

Там у горадзе да зморы
Лекар бегае да хворых
І зазвычай потым ён
Сам хварэё многа дзёён.

А ў нашай вёсцы Грыпа
Сорак год жыве з Архіпам,
І, хоць ён стары, як грыб,
Не хварэе наш Архіп.

Мы вясковы люд здаровы,
Быццам бы дубы ў дуброве,
Нас і сто ліхіх хвароб
Абяссіліць не змагло б.

Вось у нашай вёсцы Грыпа
Сорак год жыве з Архіпам,
І, хоць ён стары, як грыб,
Не хварэе наш Архіп.

KAMUNIKAT.org

**ЦЯЖКА НАВЫКАЎ ПАЗБЫЦЦА**

У Кацюшы сем падушак
Аж да самай столі,
На паказ. На іх Кацюша
Ну спала ніколі.

Ложак мяккі і прыгожы
Падакном у хаце.
На паказ стаіць і ложак,
Спіць на печы Каця.

Каці – дбалай гаспадыні –
Прывёз шафу Жэня.
Ды чамусьці мнецца ў скрыні,
Як раней, адзенне.

Кухня – дык з плітой, вядома,
На жаль, не патрэбнай.
Каця варыць па старому
Стравы ў печы хлебнай.

І няма чаго дзівіцца,
Што бывае гэтак:
Цяжка навыкаў пазбыцца
Са старога свету.

## ЧАСТУШКІ

Настаўляйце добра вушы
Каб славечак не губляць –
Мы частушкі аб Ванюшы
Тут вам хочам заспяваць.

Кажуць, мамін ён сыночак,
Ручанькі без мазаля.
Мама – гэта вол рабочы,
Ваня – ўсё жыццё цяля.

Ён ніколі свае плечы
Да работы не згінаў,
Трыццаць год ляжаў на печы –
Брухам цэглы шліфаваў.

Ён бландзінам нарадзіўся –
Ўсе гавораць, не сакрэт –
Праз усё жыццё не мыўся
І таму цяпер брунет.

Пакахаў Параску крыху
І хацеў пацалаваць.
- Хай жа яго возьме ліха,
На ім бруду фунтаў пяць.

Раз упіўся, небарака,
І пад плотам праляжаў,
І адзін толькі сабака
Яго з жалю палізаў.

А калі ўжо надаела
Вані лодыра валяць,
Пастанову падняў смела,
Каб памерці спрабаваць.

Захацеў ён утапіцца,
І пайшоў туды – сюды...
Не ўтапіўся, бо баіцца
Ваня, як агню, вады.

А аднойчы ўжо галоўку
У пятлю хацеў ўлажыць,
Ды не выйшла, бо вяроўку
Ленаваўся нават звіць.

KAMUNIKAT.org

## СКУПЫ ТРАХІМ

Калісьці быў у нас Трахім,
Які надзвычай быў скупым.
Ім кожны ўвёсцы пагарджаў
І дом яго здалёк мінаў.
Усё дадому ён валок
І замыкаў там на замок.
Пазычыць нат граша не мог,
Хто на яго ступіў парог.
Смяяліся, што ён за грош
Пагоніць нават пасвіць вош,
А ўжо за залатовак пяць
Мог бы ў Варшаву ён шагаць.
Калі ён летам луг касіў,
У лужы сухары мачыў.
Хоць сонца пражыла, як жар,
Яму на дзень хапіў сухар.
І кажуць, што праз сухары,
Ён састарэўся без пары,
Хоць меў багацця поўны двор,
Нябога з голаду памёр.
Тут хочам раду даць усім:
Не быць такімі, як Трахім.

## ХІТРЫ ДЗМІТРЫ

Кажуць, Дзмітры стаўся хітры,
Калі з вёскаю парваў.
Жыў у вёсцы – дык быў Дзмітры,
Ў горадзе ён Мечыслаў.

Калі шлюб браў у касцёле
Ды дзіця сваё хрысціў,
Бацькоў з вёскі на вяселле
І хрысьціны не прасіў.

Ён у вёску вельмі мала
Заглядае ўжо цяпер.
Хіба што прыпрэ па сала,
Ці па скуркі на каўнер.

Часам ён яшчэ памарыць,
Як больш з вёскі пацягнуць,
Там пакінуў ён гектары –
Хай жа спадчыну даюць.

Мечыслаў плюе на вёску,
Бо ўжо ў горадзе жыве.
Ён і вёсцы трэска – цёска:
Прыплыве і адплыве.

## МАЯ ЖОНКА

Маю жонку, маю хату,
Хваліць жонкі не магу,
Хай бы жыў з ёй той, хто сватаў,
Яна гне мяне ў дугу.

Жонка ўлезла мне на голаў,
Там сядзіць ўжо дваццаць год.
Будзь жа браце тут вясёлы,
Шукай шчасця, асалод.

Дома голасу не маю,
Паспрабуй тут заспявай!
Яшчэ добра калі лае,
Б'е – дык з хаты уцякай.

Жонка здзекваецца, морыць,
Каб я да другой не ўцёк,
Мяне часта у каморы
Замыкае на замок.

Не знайсці такой вам жонкі!
Яна ўночы моцна спіць,
Мне ж усю ночаньку пялёнкі
Для дзіцяці кажа мыць.

Мая жонка літраў дзвесце
Супу варыць на мой рот,
Цэлы тыдзень трэба есці,
А другі – лячыць жывот.

Хай жа возьмуць жонку чэрці!
Як жа мне яе любіць?
Не дае ніяк памерці,
Ды і цяжка з ёю жыць.

KAMUNIKAT.org

**ЛЯВОН СЯМІЖОН**

І сярод нас бывае часам
Лявон, што мае многа жон.
Ён на жанчыны надта ласы,
Бярэ наіўных у палон.

Нічога дзіўнага, прыгожы
І элегантны ён хлапец.
Таму дзяўчына хутка можа
Згадзіцца нават на вянец.

Залётна падміргне вачыма,
Маны ўсялякай скажа шмат,
Што на пасадзе ён, з грашыма,
І так спакушвае дзяўчат.

Як бачыць ён, што неўзабаве
Дзіця папросіцца на свет,
Спецыяліст у гэтай справе,
Каб знікнуць і зацерці след.

А мама дзетаньку калыша
І рукі ломіць, дзе Лявон?
Чаму ліста хоць не напіша,
Ці калі-небудзь прыйдзе ён?

kamunikat.org

Тымчасам будучы ў разгары,
Наш непакорны донжуан
Шукае новае ахвяры,
Якая пойдзе на абман.

Ён з кветкі лётае на кветку,
Быццам нявінны матылёк.
Ужо сёмая калыша дзетку...
Чакае татачкі сынок.

Тата не траціць ні хвіліны,
Да восьмай ціхенька пабег
І аматаў ізноў дзяўчыну,
Застаючыся на начлег.

Калі сустрэнеце дзяўчаты
Ў жыцці такога Левана,
Дубінай выганяйце з хаты,
Не муж ён вам, а сатана!

KAMUNIKAT.org

## ЛЮБОЎНЫ ДЫЯЛАГ

Яна: На каханага надзеі
Не магу я пакладаць.
Ён зусім кахаць не ўмее,
Не патрапіць цалаваць.

Ён: Цалаваў бы я дзяўчаткі,
Каб ім губы пазмываць.
Есці ўсё жыццё памадкі –
Дык ужо лепш галадаць.

Яна: Ці памадка перашкодай
Вам была хоць раз адзін.
Чаму ж, як мядзведзь да мёду
Ліпнеце вы да жанчын?

Ён: Я каханнем не натхнёны
Да дзяўчатак маладых.
Яны як хамелеоны
Выгляд зменьваюць у міг.

Яна: Мы, разумныя кабеты,
Абагналі вас, мужчын.
Паспрабуй жа быць брунетам,
Калі сёння ты бландзін.

kamunikat.org

**Ён:** Нас, мужчын, вы абагналі
Рознай хітрасцю сваей.
Аднаго б яшчэ жадалі
Каб радзілі мы дзяцей.

**Яна:** Здольны вы, каб вас адправіць
У агароды, на загон,
У каноплях ўсіх паставіць,
Каб пужалі там варон.

**Ён:** Я, каб гэтак было можна,
Ўсіх бы вас заладаваў
На чарговы спадарожнік
І на месяц скіраваў.

**Яна:** Мы, здаецца, нахлусілі
Надта многа ў гэты час.
Што, скажыце, мы б рабілі
Без мужчын.

**Ён:** А мы без вас?

KAMUNIKAT.org

## „ГАСПАДАРЫ”

Расказаць мы тут гатовы
Вам аб добрым і аб злым,
Аб усім у вёсцы новым
Ды і крыху аб старым.

Трактарыст вясёлы Федзя
Хмельны ходзіць кожны дзень.
Ён, як трактар, не паедзе
Без гаручага нідзе.

А калі кульне ўжо чыстай
І да працы рушыць ён.
З трактарам танцуе твіста,
Не арэ – псуе загон.

За прылаўкам крамы Янка
Вось які рахункавод:
Злотых дзесяць тысяч манка
Меў ён за мінулы год.

Добра ў малачарні Верцы,
Лепш не трэба сапраўды.
Возьме малака вядзерца,
А далье вядро вады.

Стараста царкоўны Мішка,
Хоць нядрэнна ён жыве,
Падбірае сабе крышку
Міласціну у царкве.

Што мы ўбачылі вачыма,
Падаем вам буз прыкрас.
Паўзірайцеся, магчыма,
Гаспадараць так і ў вас.

KAMUNIKAT.org

**ДАРОС ПРЫ ЧАРЦЫ**

Марцінава сямейка ўся:
Ён, сын Кастусь, ды жоннка Варка,-
Да свайго кума Міхася
Паехалі кульнуць па чарцы.

Багаты стол, каўбасы, гусь,
З гарэлкаю бутэлек гушча;
А сярод п'яніц і Кастусь
Ніяк не мог тут быць няп'ючым.

- Пі сыну мой, сказаў Марцін, -
Няма чаго табе стыдацца.
Ты ўжо ў мяне дарослы сын,
Табе год стукнула дванаццаць.

- Будзь паслухмяны мой сынок, -
Мама таксама просіць Косцю, -
Выпі гарэлкі хоць глыток,
У кума будзь сапраўдным госцем.

- Трымайся, Косця, будзь здароў!-
Гарланіць кум, які ўжо ўпіўся.
- Вып'еш, нальем табе ізноў!
Выпіў Кастусь – ды з ног зваліўса.

У воз Марцін сынка занёс
І пільнаваць загад даў Варцы.
Кастусь і сапраўды дарос
Да горкай п'яніцы прычарцы.

KAMUNIKAT.org

## ЧЫСТА ЗВЫКЛА З МАТАЦЫКЛАМ

За ашчаднасці Сярожа
Матацыкл купіў прыгожы
І на новенькім маторы
З сябрам паімчаў у горад.
Заглянулі, як заўсёды
У мясцовую гасподу.
Асушылі надта лоўка
Чыстай цэлую літроўку.
Зразумела, зухавата
Ехалі назад дахаты.
На пачатак Сяргей недзе
Па дарозе згубіў Федзю.
Калі павярнуў налева,
Вырасла на сцежцы дрэва,
І Сярожа праз хвіліну
Апынуўся на галінах.
З матацыкла дык, вядома,
Асталася куча лому.
А Сярожа наш, нябога,
Паламаў там рукі, ногі.
Поўны болю, поўны жалю,
Ляжыць доўга у шпіталі.
Ведайце, што чыста звыкла
Не сябруе з матацыклам.

**МАЛЫ ГЕРОЙ**

Ў аўтобусе увагу ўсе звярнулі
На незвычайны хлапчука манер:
Хлапчук той месца уступіў бабулі,
Што часта не здараецца цяпер.

З аўтобуса ён толькі выйсці здолеў
А ўжо акружан быў людзей таўпой.
Нат' журналіст знайшоў тут сабе ролю,
Чакаў, што скажа наш малы герой.

Збянтэжаны, падумаўшы хвілінку,
Малы герой упэўнена сказаў:
- На гэтым мусеў высядаць прыпынку,
Інакш бы месца я не уступаў.

KAMUNIKAT.org

## ЯК СТАНІСЛАЎ КАЗУ ПРАДАЎ

У нашай вёсцы Станіслаў
Гаспадаром быў небагатым.
Таму казу толькі трымаў,
Якую пасвіў каля хаты.

Як з'ела з плоту ўсю лазу,
Страхі палову на будынку,
Тады ён вырашыў казу
Прадаць у горадзе на рынку.

З казою неўзабаве ён
На рынку скромна прымасціўся.
І раптам бачыць, тут Лявон
З сусудняй вёскі паявіўся.

Лявон – вядомы ўсім таргаш,
З ім лепш ужо не задавацца.
Заўсёды ездзіў на кірмаш
Купіць, прадаць, патаргавацца.

Як на бяду прыліп аднак
Да Стасюка казы галоднай,
І, грошы сціснуўшы ў кулак,
Цаны ён дабіваўся згоднай.

Калі ён працягнуў руку
З стозалатоваю паперкай,
Казліна хапсі – і ў муку
Змалола грошы, як цукерку.

Ну, тут няшчасця ўжо чакай,
Развязкі не відаць харошай.
Лявон крычыць: „Казу давай!”,
Стасюк: ,,Не атрымаў я грошай!”

KAMUNIKAT.org

## СВАЯЦТВА

Заакіянскіх пасажыраў
У Гдыню – порт прывёз „Баторы”.
За іх тут узяліся шчыра
Грознай таможні кантралёры.

А неўзабаве скрыні, клункі,
Насілі грузчыкі да стомы.
Чакала ўжо на падарункі
Шмат сваякоў, не менш знаёмых.

Цікава, мора слоў салодкіх
Плыло ад сваякоў шматлікіх
Якраз да гэтай цёплай цёткі,
Што з багажом была вялікім.

Калі насільшчык новы клунак
Дабавіў да багажнай кучы,
Зноў не адзін быў пацалунак,
Ізноў абдымкі цётку мучаць.

І раптам пасажыр – старэча
З малым з’явіўся чамаданам.
Ніхто не выйшаў на сустрэчу,
Ніхто не аказаў пашаны.

Вось гэты прыклад надта яркі
Маіх сяброў надзвычай смуціць,
Як людзі колькасцю падаркаў
Адмерваюць свае пачуцці.

KAMUNIKAT.org

## *АЎТАБІЯГРАФІЯ*

*Маё паяўленне ў вясковай хаце 23 сакавіка 1925 года чакаў не ласкавы лёс. Белы свет я ўбачыў не адразу, пасля нараджэння, а толькі чатырохгадовым хлапчуком. Вочы мае ў маленстве заатакавала грозная трахома, і я пастаянна прабываў у цемры нізкай дзедавай хаты з шчыльна завешанымі дзяружкамі акенцамі. Аж дзіўна, што захаваў я яшчэ зрок пасля такой працяглай і знішчальнай хваробы. Ад чатырох год, праўду кажучы, і пачынаецца маё дзяцінства.*

*Убачаны ўпершыню свет здаўся мне проста дзівосным, казачным. Другі чароўны свет сустрэў я ў малюнках школьных падручнікаў маёй сястры. Так хацелася перанесціся ў гэты свет, пабываць у вялікім горадзе, сярод высокіх дамоў. Мой бацька жартаваў. „Гэта усё магчыма, трэба толькі добра нагрэць ногі і дакрануцца імі да малюнка”.*

*Мы з суседавым сынам грэлі над плітою босыя ногі і не толькі дакраналіся. а ставілі ногі на малюнку, аднак прывабны малюнкавы свет заўсёды аставаўся для нас недаступным.*

*Дома ў нас былі пераважна кніжкі на рускай мове, таму раней пазнў я гражданку, чымсьці латынскі алфавіт. Асабліва любіў я ўлазіць на гару*

*суседавай хаты, дзе ляжалі зваленыя ў кучу кніжкі з царскай прыхадской школы. Капаючыся ў гэтых кніжках, я ўжо патрапіў адрозніць свецкія ад рэлігійных. Першай кніжкай, якую я выпрасіў у суседавага сына, былі байкі Крылова. Так ад малюнкаў я перабраўся ў чароўны свет паэзіі. Пасучы з сябрамі кароў, я рыфмаваў мясцовым гайнаўскім дыялектам сатырычныя вясёлыя куплеты, прысвечаныя хлопцам, якіх не надта любіў. За гэтыя куплеты я часта здорава абрываў. Сябры смяяліся і баранілі мяне перад атакамі „пакрыўджаных”.*

*Першы верш на польскай мове пад загалоўкам „Канікулы”, які я напісаў у дванаццацігадовым узросце, асмеліўся паказаць настаўніцы польскай мовы са школы ў Орлі, куды я хадзіў адмерваючы штодзённа па пяць кіламетраў. Настаўніца прачытаўшы верш, сказала: „Прызнайся, браце, адкуль ты гэта перапісаў”? У маіх вачах закруціліся слёзы. Пазней аднак настаўніца, пазнаёміўшыся з маімі новымі вершамі, пераканалася, што гэта самастойныя пачынанні, і заахвочвала да далейшай працы. Пісаць вершы па-беларуску пачаў я ў арлянскай дзесяцігодцы. У 1940 годзе мяне накіравалі са сшыткам вершаў, у якіх усхваляў народную ўладу, на раённы конкурс дзіцячай творчасці, што адбываўся ў Бельску. Журы зацікавілася маімі вершамі і затрымала іх, каб бліжэй з імі пазнаёміцца. Неўзабаве пачалася вайна і вершы да мяне не вярнуліся. Асабліва іх не шкадую, былі ж*

*гэта перш я дзіцячыя спробы, не маючыя большай вартасьці. У час гітлераўскай акупацыі пераліваў я на паперу свой боль, выкліканы прымусовым вывазам ў Германію маіх аднавяскоўцаў, а таксама масавымі расстрэламі фашыстамі нявінных людзей у Белавежы.*

*Надыходзіць доўгачаканае вызваленне. Выжываюся ў насценгазетах беларускіх сярэдніх школ у Гайнаўцы і Бельску Падляшскім. Выезд у Варшаву ў 1946 годзе, вучоба ў Акадэміі палітычных навук, а потым у Варшаўскім універсітэце і адначасова заробак на хлеб, - усё гэта на цэлых дзесяць год спыніла маю літаратурную працу. І толькі вялікая радасць з выпадку стварэння беларускай арганізацыі і яе друкаванага органа не ўтрымала мяне ад далейшых спроб вершаскладання. ,,Я беларус” – мой першы друкаваны ў ,,Ніве” верш. За ім паявіліся наступныя. Ці ўсё, напісанае мною, мае нейкую вартасць – ацэняць чытачы і літаратурныя крытыкі. Хачу толькі сказаць адно: не магу не пісаць. Ад гэтай працяглай ,,хваробы”, якая мяне поўнасцю апанавала, сапраўды цяжка вылечыцца.*

*Віктар Швед*

ЗМЕСТ

**Бацькоўскі парог**


6 Беласточчына
7 Родная мова
8 Маці
9 У роднай хпце
11 Я беларус
12 Бацькоўскі парог
14 Рукі маці
15 Вёска
17 Летні ранак
18 Духмяны хлеб
19 Нашыя прыгажуні
20 Роздум
21 Вятрак
22 Апошні рамізнік
23 Букет гваздзікі
25 Над морам
27 Садоўнік і ружы
28 Галінка бэзу
29 Першы стрэл ,,Аўроры"
30 Вялікаму Кастрычніку
31 Ля маўзалея Леніна
33 Грамада
34 Кастусю Каліноўскаму
35 Памяці Максіма Багдановіча
36 Ля помніка Шаўчэнкі
37 Абарванае дараванне
38 Райск
39 Заклятыя ў камені


KAMUNIKAT.org

40 Сумленне
42 Бяроза і салдат
43 Ніколі больш вайны
44 Належны ранг
46 Ляці, мая песня
47 Маякі
48 Жыццёвыя сцежкі

**Кот мурлыка**

49 Вучыся мой дружа
51 Макар і буквар
52 Руплівая дачушка
53 Урок і каток
54 Сашка і мурашка
56 Яраслаў суп згатаваў
57 Працавіты тыдзень
58 Вось дык гэта быў шчупак
59 Ездзіў Федзя на веласіпедзе
60 Чакаў на апошні званок
61 Іван уводзіць балаган
62 Пецька запэцкан
63 Лянота
64 Як тут не пазніцца
66 Сядзіць Коля на таполі
67 Яраслаў штаны падраў
68 Лявон з вачэй змятае сон
69 Вожык
70 Патанулі ў рэчцы зоркі
71 Аўтаматы
72 Касманаўт
73 Каляровы змей
74 Скажы, ці дрэўца пасадзіў ты?

76 Коцікі вярбовыя
77 Шпакоўні
78 Градкі
79 Курка чубатка і гусяняткі
80 Кот і мышка
81 Станожка
82 Крот
83 Кот-абжора
84 Хто каму больш дапячэ
85 Павучок
86 Вяснушкі
87 Ці падрос я, тата?
88 Міколка і пчолка
89 Лясныя дактары
90 Якая найлепшая пара
92 Ходзяць месяцы па свеце
96 Хто памаляваў лісты
97 Восень
98 Задавака-баравік
99 Рэха
100 Мухамор
101 Зіма
102 Ёлка
103 Дзіўны мастак
104 Барада
105 Кармушкі
106 Лянівая вавёрка
107 Коцік-бязбоцік
108 Далёка да сонца
109 Каб добра сон убачыць
110 Сынок і свісток

111 Пільнавала Ганула малако
ў каструлі
113 Шарыкі
114 Мыш у збане
115 Чаму вада салёная ў моры
116 Цікаўны сынок
117 Цягнік
119 Каб паехала нам хата
120 Ты была ў сне таксама
121 Мілы гном, дзе твой дом?
123 Канікулы

**Выбачайце, калі ласка**

126 Правітальнае слова
129 Вось як роўна дзесяць год
яны крочылі ў народ
130 Мы вясковы люд здаровы
132 Цяжка навыкаў пазбыцца
133 Частушкі
135 Скупы Трахім
136 Хітры Дзмітры
137 Мая жонка
139 Лявон-сяміжон
141 Любоўны дыялаг
143 „Гаспадары”
145 Дарос прычарцы
147 Чыста звыкла з матацыклам
148 Малы герой
149 Як Станіслаў казу прадаў
151 Сваяцтва
153 Аўтабіяграфія

Рэдакцыйная калегія

Мікалай Лобач
Іван Чыквін
Ада Чэчуга

Карэктар

Мікалай Лобач

Фота

Здзіслаў Зарэмба

Białostockie Zakłady Graficzne
zlec. 819 nakład 5000 format A6
pap. sat. kl III 70 g 61x86 M-2

KAMUNIKAT.org